Голас Радзімы

№ 35 (1813)
1 верасня 1983 г.

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ПА КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЯХ З СУАЙЧЫННІКАМІ ЗА РУБЯЖОМ
(БЕЛАРУСКАЕ ТАВАРЫСТВА «РАДЗІМА»)

Выдаецца з 1955 г.
Цана 4 кап.

Такую карціну ўжо не ўбачыш сёння на збожжавых нівах. Яна засталася ў нашай памяці як напамін аб шчодрым леце 1983 года. Багаты ўраджай сабралі сёлета у нашай Беларусі. Жніву спрыяла і добрае надвор'е. Але ў вёсцы яшчэ многа работы. Настаў верасень — пара ўборкі бульбы. І замест збожжавых на палеткі выйшлі бульбаўборачныя камбайны.

Фота М. АМЕЛЬЧАНКІ.

ЧАЛАВЕК І ПРЫРОДА

ЗБЕРАГЧЫ ДЛЯ НАШЧАДКАЎ

Клопаты аб ахове і рацыянальным выкарыстанні прыродных рэсурсаў у Беларусі, як і ў цэлым у СССР, узведзены ў ранг дзяржаўнай палітыкі. Гэтае палажэнне замацавана ў Канстытуцыі Беларускай ССР. У вышэйшым органе ўлады — Вярхоўным Савеце БССР, а таксама ў мясцовых Саветах дзейнічаюць пастаянныя дэпутацкія камісіі па ахове прыроды. Гэтымі праблемамі займаецца шэраг рэспубліканскіх міністэрстваў. А ў якасці міжведамаснага кантрольна-распарадчага органа выступае Дзяржаўны камітэт БССР па ахове прыроды. У гутарцы з журналістам Вячаславам ХАДАСОЎСКІМ аб дзейнасці камітэта расказвае яго старшыня Віктар КАЗЛОЎ.

— Скажыце, Віктар Аляксеевіч, чым выклікана рэзкая актывізацыя ў апошнія гады прыродаахоўнай дзейнасці ў рэспубліцы?

— Узрастаючымі маштабамі ўплыву чалавека на навакольнае асяроддзе. Асваенне новых сельскагаспадарчых угоддзяў на месцы прыродных балот, здабыча карысных выкапняў — нафты, калійнай руды, торфу, бурага вугалю, будаўнічых матэрыялаў, асваенне значных запасаў лесасыравінных і водных рэсурсаў, узвядзенне буйных прамысловых прадпрыемстваў ператварыла Беларусь у высокаінтэнсіўную аграрна-прамысловую рэспубліку. Прамысловасць Беларусі зараз вырабляе прадукцыі ў 32 разы больш, чым у 1940 г.

Аднак не трэба думаць, што толькі зараз чалавечая дзейнасць уступае ў супярэчнасць з прыродай. Хутчэй наадварот, толькі на сучасным этапе гісторыі краіны — пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года пакладзены канец драпежніцкаму рабаванню прыродных рэсурсаў. Можна прывесці нямала прыкладаў, як па меры росту магутнасці краіны, матэрыяльна-тэхнічнай базы народнай гаспадаркі, удасканальваліся прыродаахоўныя функцыі дзяржавы. Успомнім, што ўжо ў 1925 годзе ў паўночнай частцы БССР быў створаны Бярэзінскі дзяржаўны запаведнік, а ў 1939 запаведнікам аб'яўлены другі унікальны куток еўрапейскай прыроды — Белавежская пушча. Пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны 1941—1945 гадоў паглыбленыя навуковыя даследаванні прыроднага комплексу выявілі новыя тэрыторыі, якія падлягаюць ахове. Толькі за 1976—1980 гады на ахову прыроды ў рэспубліцы расходавана каля 300 мільёнаў рублёў.

Зараз індустрыя і сельская гаспадарка ўзялі курс на інтэнсіфікацыю. Натуральна, што інтэнсіўнымі і нават апярэджваючымі становяцца і меры па ахове прыроды. Мы павінны не толькі зберагчы для нашчадкаў сённяшнюю прыгажосць зямлі, але і выправіць пралікі, дапушчаныя раней.

— На якой заканадаўчай аснове базіруецца дзейнасць прыродаахоўных органаў?

— Ахова прыроды — састаўная частка праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця і росту дабрабыту народа. Гэта прынцыпова. За апошнія 10 гадоў у сувязі з гэтым ажыццёўлены комплекс навукова абгрунтаваных прававых, тэхнічных, эканамічных і арганізацыйна-практычных мерапрыемстваў, якія адпавядаюць узрослым патрабаванням дня. У прыватнасці, мадыфікавана галіновае заканадаўства, якое датычыць усіх асноўных рэсурсаў прыроды. Вярхоўным Саветам Беларускай ССР зацверджаны і дзейнічаюць дзяржаўныя кодэксы: зямельны (1971 год), водны (1973 год), аб нетрах (1977 год), лясны (1980 год), законы аб ахове і выкарыстанні жывёльнага свету (1981 год), аб ахове атмасфернага паветра (1981 год). Плюс да гэтага шырокую сістэму прававых норм, накіраваных на прадухіленне забруджванняў і паляпшэнне навакольнага асяроддзя, прадугледжвае заканадаўства аб ахове здароўя.

У прынятай у 1978 годзе Канстытуцыі БССР выказаны ўсе 10 прынцыпаў Заключнага Акта Нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе, падпісанага ў Хельсінкі. Вось, напрыклад, што гаворыць адзін з многіх артыкулаў Канстытуцыі, які носіць экалагічную накіраванасць: «У інтарэсах сучасных і будучых пакаленняў у Беларускай ССР прымаюцца неабходныя меры для аховы і навукова абгрунтаванага, рацыянальнага выкарыстання зямлі і яе нетраў, водных рэсурсаў, расліннага і жывёльнага свету, для захавання ў чысціні паветра і вады, забеспячэння ўзнаўлення прыродных багаццяў і паляпшэння навакольнага асяроддзя, якое акружае чалавека».

Гэта наша заканадаўчая база. Гэта ж — кола задач, якія вырашаюць прыродаахоўныя органы. Дзяржкамітэт БССР па ахове прыроды вядзе кантроль за правільнасцю выканання ўсіх прыродаахоўных заканадаўчых норм прадпрыемствамі і арганізацыямі, незалежна ад іх ведамаснага падпарадкавання. Мы сочым таксама за вядзеннем паляўнічай гаспадаркі, за мерамі па ахове і абагачэнню флоры і фауны, за развіццём запаведнай справы.

У камітэта велізарныя правы. Перад ім трымаюць справаздачу ўсе міністэрствы, мы абследуем прадпрыемствы, будоўлі, установы. Ніводзін гаспадарчы праект не прымаецца без нашай папярэдняй экалагічнай экспертызы, не ўводзіцца ў эксплуатацыю ніводзін аб'ект. Пакуль сваю згоду не дадуць кантрольныя органы, якія сочаць, каб

падзеі • людзі • факты

КАРЫСНАЯ ІНІЦЫЯТЫВА

ПРАДУХІЛІЦЬ МІЛІТАРЫЗАЦЫЮ КОСМАСУ

Міністр замежных спраў СССР А. Грамыка даслаў генеральнаму сакратару ААН пісьмо і праект Дагавора аб забароне прымянення сілы ў касмічнай прасторы і з космасу ў адносінах да Зямлі. Гэтае пытанне Савецкі Саюз прапаноўвае ўключыць у парадак дня 38-й сесіі Генеральнай Асамблеі ААН.

Важнай асаблівасцю гэтага праекта дагавора з'яўляецца спалучэнне палітыка-прававых абавязацельстваў дзяржаў не дапускаць прымянення сілы ў адносінах адна да адной у космасе і з космасу з мерамі матэрыяльнага характару, накіраванымі на недапушчэнне мілітарызацыі касмічнай прасторы.

Канкрэтна Савецкі Саюз за тое, каб поўнасцю забараніць выпрабаванні і разгортванне ў космасе любой зброі касмічнага базіравання для паражэння аб'ектаў на Зямлі, у паветранай і касмічнай прасторы.

Ён выступае таксама за радыкальнае вырашэнне пытання аб процістадарожнікавай зброі: поўная адмова дзяржаў ад стварэння новых процістадарожнікавых сістэм, а таксама ліквідацыя ўжо наяўных у іх такіх сістэм.

Удзельнікі дагавора абавязаліся б таксама і якім-небудзь іншым чынам не знішчаць, не пашкоджваць, не парушаць нармальнага функцыянірання і не змяняць траекторыі палёту касмічных аб'ектаў іншых дзяржаў.

Акрамя таго, прапаноўваецца забараніць выпрабаванні і выкарыстанне ў ваенных, у тым ліку процістадарожнікавых, мэтах пілатуемых касмічных караблёў, прымяненне якіх павінна цалкам служыць вырашэнню разнастайных навукова-тэхнічных і эканамічных задач.

ПРАПАНАВАЛІ ВУЧОНЫЯ

АЎТАМАТЫКА ПРАЦУЕ НА ЎРАДЖАЙ

Павысіць ураджайнасць меліяраваных зямель на 10—15 працэнтаў і значна скараціць колькасць абслугоўваючага персаналу польдэрных помпавых станцый — гэтыя дзве, на першы погляд, не звязаныя паміж сабой праблемы вырашылі адной распрацоўкай вучоныя і спецыялісты Беларусі. Яны перадалі меліяратарам-эксплуатацыйнікам праектную дакументацыю сістэмы аўтаматызацыі польдэрных помпавых станцый. Яна — першая «таварная» прадукцыя самай маладой навуковай установы рэспублікі — мінскага канструктарска-тэхналагічнага аддзела аб'яднання «Саюзводсістэмаўтаматыка».

Аўтары распрацоўкі, а вялася яна сумесна з вучонымі Маскоўскага і Ровенскага гідрамеліярацыйных інстытутаў, прапанавалі ўстанаўліваць на асушаных плошчах спецыяльныя датчыкі. І тое, што яшчэ сёння вызначаецца інстынктыўна, прыблізна, зробіць аўтаматыка і тэлемеханіка — не толькі збярэ, ацэніць інфармацыю пра стан зямель на тым або іншым участку, але і «падкажа» аптымальны ўзровень вільготнасці глебы, калі падымаць або скідваць узровень вады ў каналах.

ЖЫВАТВОРНАЯ СІЛА ФОСФАГІПСУ

Рацыянальны спосаб выкарыстання фосфагіпсу прапанавалі супрацоўнікі Інстытута торфу Акадэміі навук БССР і Беларускага навукова-даследчага інстытута глебазнаўства і аграхіміі. Ён заключаецца ў прымяненні яго як састаўной часткі новага комплекснага арганамінеральнага гранулянага ўгнаення на аснове торфу. Наяўнасць торфу і фосфагіпсу ў складзе ўгнаення павышае ўстойлівасць яго пажыўных элементаў, што ў сваю чаргу садзейнічае змяншэнню непрадукцыйных страт.

Эканамісты разлічылі эфектыўнасць прымянення такога ўгнаення, напрыклад, пад цукровыя буракі. Аналіз паказаў, што затраты на ўборку дапрацоўку і рэалізацыю дадатковага ўраджаю, а таксама на вытворчасць гектарнай нормы новага ўгнаення значна ніжэй у параўнанні з коштам дадатковай прадукцыі.

ЛЕЧАЦЬ... ФІЗІКІ

Вучоныя лабараторыі лазерных сістэм і прыбораў Інстытута фізікі Акадэміі навук БССР перадалі комплекс лазерных установак урачам Беларускага цэнтра трансплантацыі ныркі. Тут упершыню ў краіне пачнуць прымяняць аптычныя квантавыя генератары для пасляаперацыйнага лячэння хворых з перасаджанай ныркай.

Цэнтр трансплантацыі — не першая лячэбная ўстанова, аснашчаная прыборамі, распрацаванымі беларускімі фізікамі. Ужо некалькі гадоў медыкі Мінска паспяхова прымяняюць гаючае святло для лячэння трафічных язваў і астэахандрозаў, хранічных пнеўманій і радыкулітаў, доўга не зажываючых ран і бранхіяльнай астмы, пачынаюць выкарыстоўваць яго і ў рэфлексатэрапіі — прамені ўздзейнічаюць на біялагічна актыўныя кропкі і пазбаўляюць чалавека ад розных алергій.

ВЫСТАЎКІ

У ПАВІЛЬЁНЕ «ТРАНСПАРТ»

На ВДНГ СССР у павільёне «Транспарт» працягваецца паказ дасягненняў рачнікоў нашай краіны. Галоўрачфлот Беларусі прадстаўляе тут калектыў Пінскага суднабудаўнічa-суднарамонтнага завода.

На суд спецыялістаў, масквічоў і гасцей сталіцы гаспадары водных магістралей рэспублікі выпеслі дзве мадэлі несамаходных барж, якія будуюцца карабеламі Рэчыцы і Петрыкава. За стварэнне гэтых навінак праектна-канструктарскае бюро Галоўрачфлоту БССР зацверджана ўдзельнікам галоўнай выстаўкі краіны, а асобныя работнікі ўдастоены сярэбраных і бронзавых медалёў.

СЕЛЬСКІЯ НАВІНЫ

Дзесяць тысяч гектараў зямель плануюць здаць у вытворчую эксплуатацыю сёлета меліяратары Прынямоння. Добра працуюць многія перасоўныя механізаваныя калоны трэста «Гроднаводбуд». Брыгада, якой кіруе Яніна Хадарцэвіч, з пачатку пяцігодкі праклала больш за 350 кіламетраў закрытага дрэнажу.

НА ЗДЫМКУ: укладка дрэнажных труб на аб'екце ў калгасе імя XXII з'езда КПСС Іўеўскага раёна. На пярэднім плане — Я. ХАДАРЦЭВІЧ.

«НАВАСЕЛЛІ» НА САЖАЛКАХ

У штучных азёрах рыбгаса «Сялец» Бярозаўскага раёна плошчай восемсот гектараў сёлета запушчана каля 25 мільёнаў лічынак люстранога карпа, буфало і белага амура.

«Сялец», які ствараюць у сярэднім цячэнні Ясельды беларускія меліяратары, раскінецца на плошчы 2 200 гектараў і разлічаны на вытворчасць 26 тысяч цэнтнераў сталовай рыбы ў год. Акрамя сажалак, у забалочанай пойме ўзводзяцца плаціна, загараджальная земляная дамба вадасховішча, прызначанага для забеспячэння вільгаццю не толькі комплексу, але і лугоў, пашы жывёлагадоўчых гаспадарак.

На меліярацыйных сістэмах Брэстчыны створана больш чым 200 вадаёмаў. Яны надзейна служаць і земляробам, і рыбаводам. У басейнах рэк Лань і Бобрык з'явіліся рыбгасы «Лактышы» і «Палессе».

РЫХТУЮЦЦА ДА КОНКУРСУ

Адна з вёсак саўгаса «Кармянскі» — Кароцькі, што на Гомельшчыне, рыхтуецца да Усесаюзнага конкурсу на лепшую забудову і добраўпарадкаванне. Штогод тут з'яўляюцца новыя жылыя дамы, адміністрацыйныя будынкі. Нядаўна будаўнікі здалі «пад ключ» гандлёва-бытавы комплекс. У ім размясціліся сталовая, комплексны прыёмны пункт, гандлёвыя залы для продажу харчовых і прамысловых тавараў.

Толькі на гэтую новабудоўлю саўгас выдзеліў 300 тысяч рублёў. Хутка з'явяцца на вёсцы сучасны Дом культуры, гасцініца, спартыўны цэнтр.

ВЫТВОРЧЫЯ МАГУТНАСЦІ

Мінская ЦЭЦ-3 — адна са старэйшых у беларускай сталіцы. За трыццаць гадоў работы прадпрыемства выпрацоўка электраэнергіі ўзрасла тут у сто разоў. Энергетыкі бесперабойна і надзейна забяспечваюць буйнейшыя жылыя і прамысловыя раёны Мінска электрычнай і цеплавой энергіяй.

НА ЗДЫМКУ: за пультам кіравання катламі ветэраны вытворчасці, машыністы А. ІВАНОЎ і В. КАСЦЯНЕВІЧ.

у яго комплексе абавязкова былі ачышчальныя збудаванні, што гарантуюць бясшкоднасць данай вытворчасці для прыроды. Камітэт мае права (і карыстаецца ім) закрываць дзеючыя прамысловыя прадпрыемствы, калі яны наносяць шкоду навакольнаму асяроддзю.

— З 1974 года ў рэспубліцы ўведзена планаванне прыродаахоўных мерапрыемстваў. Яно ажыццяўляецца на падставе распрацаванага агульнаэканамічнага прагнозу магчымых змен у біясферы ў сувязі з развіццём галін народнай гаспадаркі рэспублікі да 2000 года. У ным сутнасць гэтага і іншых асноўных прыродаахоўных праектаў і якія асноўныя вынікі іх укаранення?

— Акрамя названага прагнозу вучоныя разам з практыкамі распрацавалі і паспяхова ажыццяўляюць перспектыўныя галіновыя праекты, комплексныя схемы выкарыстання і аховы прыродных рэсурсаў. Складзена, напрыклад, Генеральная схема выкарыстання зямельных рэсурсаў рэспублікі, схема комплекснага выкарыстання воднага багацця, схемы зон адпачынку і турызму, асобных рэгіёнаў уздоўж рэк, вакол азёр, развіцця запаведных зон...

Такая комплексная, добра «падлічаная» спецыялістамі ўсіх профіляў распрацоўка дазваляе планаваць, праектаваць і эксплуатаваць заводы, шахты, буйныя аграпрадпрыемствы і новыя населеныя пункты, улічваючы, а, значыць, і рэгулюючы далёка ідучыя вынікі іх стварэння на ўвесь экалагічны комплекс. Гэта велізарная перавага, якую дае планавае вядзенне гаспадаркі ў СССР. Плённых вынікаў такога прадбачання ўжо нямала ў рэспубліцы.

Наша бясцэннае багацце — зямля. Прайшлі тыя часы, калі зямельныя ўгоддзі шчодра адводзіліся пад розныя гаспадарчыя аб'екты. На ўлік узяты кожны гектар урадлівых глеб. Пад новабудоўлі адводзяць толькі няўдобіцы. Такая палітыка не толькі палепшыла структуру зямельных рэсурсаў, павысіла ўрадлівасць глеб, але і вярнула велізарныя масівы парушаных індустрыяльнай дзейнасцю зямель. Толькі за апошнія 10 гадоў рэкультывавана 100 тысяч гектараў адпрацаваных угоддзяў. Зараз плошча вернутых «да жыцця» зямель адпавядае плошчы парушаемых у працэсе прамысловых распрацовак карысных выкапняў. Задача ставіцца так: што адпрацавана летась, павінна быць адноўлена ў наступным годзе. У Беларусі за 1981 — 1985 гады трэба рэкультываваць 55 тысяч гектараў.

Блізка з гэтай праблемай мяжуецца задача аховы лясоў. Дзякуючы інтэнсіўным пасадачным работам у рэспубліцы дасягнута аптымальная для экалагічнай раўнавагі лясістасць — 35 працэнтаў. Значная частка лясных угоддзяў (каля мільёна гектараў) узята пад ахову дзяржавы. Зараз ахоўваемыя прыродныя аб'екты ўключаюць 2 запаведнікі, 2 запаведна-паляўнічыя гаспадаркі, 4 гідралагічныя, 4 ландшафтныя, 1 лясны, 8 азёрных, 32 батанічныя і 6 паляўнічых заказнікаў, 200 помнікаў прыроды. К 1990 году плошча запаведных аб'ектаў павялічыцца да 10 працэнтаў. На 36,7 працэнта за 10 год павялічылася і працягвае расці плошча зялёных зон вакол гарадоў.

З мэтай аховы водных рэсурсаў шырока ўкараняюцца сістэмы зваротнага і паўторнага водазабеспячэння прамысловых прадпрыемстваў. Ужо ў 1980 годзе яны на 82 працэнты задавольвалі патрэбу індустрыі рэспублікі ў вадзе. Спажыванне чыстай вады на гэтыя мэты за апошняе пяцігоддзе паменшылася на 40 працэнтаў, нягледзячы на рост аб'ёму вытворчасці.

Інтэнсіўна вядзецца збудаванне ўстановак газаачысткі, што дазволіла значна скараціць выкіды шкодных рэчываў у атмасферу.

— Вы нічога не сказалі аб «братах нашых меншых»...

— Створана «Чырвоная кніга БССР», куды занесена 80 відаў розных жывёл і 85 — раслін. Яны ўзяты пад асобы нагляд. Дадам, што ў рэспубліцы забаронена здабыча дзікіх жывёл і раслін, гандаль якімі рэгулюецца ў адпаведнасці з Канвенцыяй аб міжнародным гандлі відамі дзікай фауны і флоры, якія знаходзяцца пад пагрозай знікнення. Робіцца дзяржаўны ўлік колькасці жывёл і іх узнаўлення. Упэўнены, што «Чырвоная кніга» ў хуткім часе значна «пахудзее».

— Якую дапамогу ў дзейнасці камітэта аказвае грамадскасць?

— Самую актыўную, без якой тэмпы прагрэсу ў гэтай галіне былі б, вядома, значна меншымі. Гэта перш за ўсё актыў Беларускага таварыства аховы прыроды, якое налічвае ў сваім складзе трэць насельніцтва рэспублікі.

У таварыстве створаны метадычныя секцыі па галінах народнай гаспадаркі. Іх узначальваюць высокакваліфікаваныя спецыялісты і вучоныя. Таварыства вядзе шырокую прапаганду ідэй аховы прыроды, дапамагае дзяржаўным органам аператыўна выяўляць недахопы, знаходзіць шляхі для іх ліквідацыі. У прамысловых і транспартных прадпрыемствах, калгасах, установах рэспублікі налічваецца звыш 17 тысяч пярвічных арганізацый таварыства. Сярод актывістаў — 6 тысяч грамадскіх інспектараў, якія дапамагаюць дзяржаўным органам у барацьбе з парушэннямі патрабаванняў Закона аб ахове прыроды Беларускай ССР, іншых прыродаахоўных норм і правіл.

— Якія бліжэйшыя задачы ў галіне аховы прыроды ў рэспубліцы?

— Працягваць работу па ўсіх пачатых кірунках у адпаведнасці з комплекснымі прагнозамі. Асаблівая ўвага будзе ўдзелена, напрыклад, стварэнню і паўсюднаму ўвядзенню безадыходных і малаадыходных прамысловых тэхналогій. Узровень навукова-тэхнічнага прагрэсу ў краіне дазваляе рашуча брацца за гэту праблему. У сувязі з ажыццяўленнем Харчовай праграмы СССР будзе актыўна развівацца аграпрамысловы комплекс. Таму ўжо зараз працуем над стварэннем сістэм ачысткі выкідаў буйных ферм. Тут велізарную дапамогу аказваюць вучоныя. Дарэчы, моцная сувязь прыродаахоўнай справы з навукай будзе галоўнай адметнай рысай нашай дзейнасці.

Буйнейшы ў Віцебскай вобласці універсальны магазін адкрыўся ў раённым цэнтры Глыбокае. Тавары тут размешчаны па прынцыпу «адзёжнай шафы»: дастаткова ведаць памер адзення, каб у секцыі пад адпаведным нумарам знайсці ўсё неабходнае — ад галаўнога ўбору да паліто.
Побач з гандлёвымі залямі, агульнай плошчай 2 000 квадратных метраў ва універмагу прадугледжаны і іншыя зручнасці для пакупнікоў — камера захавання, кафетэрый, радыёвузел.

НА ЗДЫМКАХ: агульны выгляд універмага; у аддзеле дзіцячай цацкі.

Фота А. ЦАРЛЮКЕВІЧА.

ЧЫЯ ПАМЯЦЬ БЕЗ ПРАВАЛАЎ?

Калі вам давядзецца пачуць, што ў памяці ЭВМ многа правалаў, не спяшайцеся рабіць катэгарычны вывад. Машына гэта якраз можа аказацца добрай. А аб'ём памяці ў дзесяць тысяч разоў большы, чым у сучасных камп'ютэраў, ёй забяспечаць іменна правалы — характэрныя зігзагі на малекулярным спектры.

Магчымасць стварэння прынцыпова новых запамінаючых канструкцый адкрывае цікавы эфект, які выяўлены вучонымі Інстытута фізікі Акадэміі навук Беларусі. Яны заўважылі, што пры вельмі нізкіх тэмпературах у адным з арганічных злучэнняў атамы вадарода паводзяць сябе даволі своеасабліва. Варта толькі гэтаму рэчыву апынуцца ў полі светлавога промня, як атамы адразу ж «перасяляюцца» ў іншае месца сваіх жа малекул. На знятым спектры «прапажа» фіксуецца дакладным зломам лініі.

— Здавалася, ці вялікая гэта падзея? — гаворыць загадчык лабараторыяй інстытута, доктар фізіка-матэматычных навук К. Салаўёў. — Але калі падумаць, то беглы атам можа саслужыць добрую службу. Памяць жа машын заснавана на дваічнай сістэме злічэння. Пры гэтым за адзінку прымаецца які-небудзь адзін стан рэчыва, а за нуль — другі. У першых машынах адзінкамі і нулямі былі ферытавыя сардэчнікі — намагнічаныя і размагнічаныя. Затым гэты ж прынцып выкарысталі для магнітнага запісу на стужку, што дазволіла намнога ўшчыльніць банк інфармацыі. Але сёння і гэтага ўжо недастаткова. Перспектыўныя машыны патрабуюць яшчэ больш кампактных сістэм памяці, і нам уяўляецца, што выхад са становішча — гэта запамінаючыя канструкцыі, заснаваныя на эфекце правалаў у спектры. Інфармацыя ў іх будзе запісвацца на арганічныя пласціны вельмі тонкім промнем лазера.

ХАРЧОВАЯ ПРАГРАМА: РАЗЛІКІ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ

АГРАПРАМЫСЛОВЫ КОМПЛЕКС

Сярод эканамічных і сацыяльных праблем любога грамадства важнейшае месца займае харчовая праблема.

Таксама зусім натуральна, што вытворчасць прадуктаў харчавання патрабуе ад грамадства немалых намаганняў і сродкаў. І як паказвае сённяшняя практыка, размер іх павінен пастаянна ўзрастаць.

Калі мы возьмем прыклад Савецкага Саюза, то можна прывесці наступную лічбу. У бягучай пяцігодцы (1981—1985) капітальныя ўкладанні ў аграпрамысловы комплекс краіны вызначаны ў аб'ёме 233 мільярды рублёў. Такіх буйных інвестыцый у гісторыі краіны яшчэ не было. Яны вылучаюцца ў адпаведнасці з Харчовай праграмай СССР, разлічанай на перыяд да 1990 года.

У што павінны выліцца гэтыя меры з пункту гледжання радавога спажыўца, сярэдняй савецкай сям'і?

Адзначым для пачатку кропку адліку. Каларыйнасць харчавання насельніцтва СССР ужо на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў знаходзіцца на рэкамендуемым навукай узроўні (звыш трох тысяч калорый у дзень на чалавека). Але структура харчавання мае патрэбу ў паляпшэнні. Скажам, бульбы і хлеба ў СССР спажываюць больш, чым раяць медыкі, а вось мяса, фруктаў, гародніны — пакуль менш. Патрэбны такія пераўтварэнні ў структуры харчавання, якія забяспечаць рацыянальнае, збалансаванае спалучэнне бялкоў, тлушчаў і вуглявodаў.

Задача гэта паўстала не ўчора, і зрухі ў яе вырашэнні ёсць. Так, з 1965 года валавая прадукцыя сельскай гаспадаркі ў краіне вырасла на 50 працэнтаў (адпаведны паказчык у краінах «Агульнага рынка» — 31 працэнт, а ў ЗША — 29 працэнтаў).

А паколькі рост сельскагаспадарчай вытворчасці сістэматычна абганяе ў СССР рост насельніцтва (яно за той жа час павялічылася на 15 працэнтаў), то і аб'ём прадукцыі сельскай гаспадаркі на душу насельніцтва за гэты перыяд павялічыўся на 28 працэнтаў.

Харчовая праграма 80-х гадоў замацоўвае гэтыя прыярытэты. Яны зыходзяць як з рэальных патрэб, так і з рэальных магчымасцей. Скажам, па рыбапрадуктах, цукру рост будзе адносна невялікім. У 1990 годзе ў параўнанні з 1980-м душавое спажыванне рыбы і рыбапрадуктаў вырасце на 1,4 кілаграма (да 19 кілаграмаў), цукру — на 1,1 кілаграма (да 45,5 кілаграма). Тут вялікі рост і не патрэбен: узровень спажывання ў краіне высокі, зыходзячы з фізіялагічных норм. Спажыванне хлебапрадуктаў нават знізіцца, што таксама з'яўляецца ўстойлівай тэндэнцыяй, таму што іх на душу насельніцтва і сёння прыпадае больш, чым трэба. Затое спажыванне мяса вырасце на 12 кілаграмаў (дарэчы, яно і сёння ўжо перавышае паказчыкі такіх краін рынкавай эканомікі, як Нарвегія, Італія, Грэцыя, Іспанія, Партугалія, Японія).

Трэба сказаць, што ўсё гэта яшчэ не будзе азначаць прывядзення рэальнага спажывання прадуктаў харчавання ў поўную адпаведнасць з тымі нормамі, якія рэкамендуюць медыкі. Але будзе зроблены чарговы істотны крок у прыбліжэнні да іх. Вядома, пажадана максімальна паскорыць гэты працэс, але эканоміка — прадмет рэальны, і яна не можа грунтавацца на невыканальных пражэктах.

Рэаліі ж — гэта тыя магчымасці, якія мае сёння савецкі аграпрамысловы комплекс і якімі ён будзе валодаць у бліжэйшыя гады. Дарэчы, гутарка ідзе менавіта аб аграпрамысловым комплексе, а не проста аб сельскай гаспадарцы. І справа не толькі ў тым, што прадукцыя сельскай гаспадаркі выкарыстоўваецца больш чым у 80 галінах народнай гаспадаркі, а і ў тым, што калі ў 1959 годзе ў сельскую гаспадарку паступала прадукцыя 28 галін яго, то цяпер ужо больш за 90 галін.

Магчымасці аграпрамысловага комплексу — гэта тое, што парк трактароў у сельскай гаспадарцы ў 1982 годзе складаў больш за 2,5 мільёна штук, збожжаўборачных камбайнаў — больш за 700 тысяч, грузавых аўтамабіляў — больш за 1,6 мільёна.

Гэта тое, што на сельскагаспадарчых прадпрыемствах цяпер працуе каля 2 мільёнаў спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй.

Гэта ўкараненне прагрэсіўных форм арганізацыі працы (напрыклад, так званага брыгаднага падраду, які дае магчымасць больш гібка весці гаспадарку і значна паскараць рост прадукцыйнасці працы).

І нарэшце, капіталаўкладанні. Тут зноў-такі важны сацыяльны момант. Справа ў тым, што па прынцыповых меркаваннях Савецкая дзяржава не перакладае на спажыўца дадатковае фінансаванне сельскай гаспадаркі (як і ў многіх іншых развітых краінах, яно ў СССР карыстаецца буйнымі дзяржаўнымі датацыямі). Асноўная ж частка савецкіх бюджэтных рэсурсаў (91,6 працэнта) фарміруецца за кошт плацяжоў дзяржаўных і каператыўных прадпрыемстваў і арганізацый. Так, з 1 студзеня 1983 года ў краіне павышаны дзяржаўныя закупачныя цэны на буйную рагатую жывёлу, свіней, авечак, малако, збожжа, цукровыя буракі, бульбу, гародніну. Уводзяцца таксама надбаўкі да цэн на прадукцыю, якая вырабляецца ў горшых умовах, у стратных і нізкарэнтабельных гаспадарках. Расходы дзяржавы на гэтыя мэты складуць 16 мільярдаў рублёў у год. У той жа час насельніцтва гэтыя грошы «сэканоміць», таму што будзе набываць прадукты па ранейшых цэнах. І такім чынам, калі дзяржава даплачвала да рознічнай цаны 1 кілаграма ялавічыны (2 рублі) яшчэ 2 рублі 4 капейкі, то цяпер яна будзе даплачваць 2 рублі 99 капеек, гэта значыць амаль у паўтара раза больш. Аналагічная карціна з цэнамі на малако і масла. Гэта рэалізацыя паслядоўнага курсу дзяржавы, пры якім упор робіцца на павелічэнне вытворчасці прадуктаў харчавання пры адначасовым стымуляванні іх растучага спажывання.

Сямён ЗДАБКОЎ,
прафесар, доктар эканамічных навук.

ОТВЕТЫ Ю. В. АНДРОПОВА НА ВОПРОСЫ ГАЗЕТЫ «ПРАВДА»

Вопрос. В преддверии нового раунда советско-американских переговоров об ограничении ядерных вооружений в Европе хотелось бы узнать, соответствуют ли действительности имеющие хождение на Западе утверждения о том, что на предыдущем раунде этих переговоров американская сторона выдвинула какие-то гибкие предложения, позволяющие надеяться на продвижение вперед?

Ответ. Нет, не соответствуют. Никакого продвижения на переговорах пока нет, и надеяться на него при сохранении нынешней позиции США, к сожалению, не приходится.

Вся «гибкость» американской позиции сводится к следующему.

Раньше США предлагали, чтобы СССР сократил до нуля, то есть уничтожил все свои ракеты средней дальности, причем не только в европейской, но и в восточной части страны (что вообще не имеет отношения к предмету переговоров в Женеве), в то время как со стороны НАТО вовсе ничего не уничтожалось бы—ни одной ракеты, ни одного самолета—или, образно говоря, их сокращения равнялись бы нулю. В этом и заключался смысл американского «нулевого варианта»—для СССР ноль ракет, а для НАТО ноль сокращений.

Теперь же США согласны, видите ли, чтобы СССР сохранил определенное количество своих ракет средней дальности, но в этом случае США не только опять-таки не сокращали бы ни одной единицы ядерных средств средней дальности, а, более того, получали бы «право» разместить в Европе—в дополнение к уже имеющимся здесь английским и французским ракетам—новые американские ракеты в количестве, равном числу остающихся советских ракет. Другими словами, мало того, что мы в одностороннем порядке сократили бы свой арсенал ядерных средств средней дальности, мы должны были бы еще и благословить размещение новых американских ракет, нацеленных на нас и наших союзников.

Называть это гибкостью можно лишь в порядке издевательства над здравым смыслом.

Если говорить о гибкости в подлинном, конструктивном смысле этого слова, то на всем протяжении переговоров ее проявляет Советский Союз, но никак не Соединенные Штаты.

Именно Советский Союз предложил не фальшивый, а настоящий нулевой вариант для Европы—уничтожить все ядерные средства как средней дальности, так и тактические. Но США и разговаривать об этом не хотят.

Коль скоро Запад не готов к такому радикальному решению,—а наша готовность к нему остается в силе, — мы предложили другой, не столь радикальный, но тоже далеко идущий вариант: отказаться от развертывания в Европе любых новых средств средней дальности, а все существующие сократить примерно в три раза, оставив пока по 300 единиц таких средств у СССР и на стороне НАТО.

В связи с утверждениями на Западе о несправедливости такого варианта, поскольку СССР мог бы, дескать, в пределах разрешенных 300 единиц сохранить больше ракет, чем их есть на стороне НАТО, мы заявили о готовности оставить после сокращений в Европе ровно столько ракет средней дальности, сколько их имеется у Англии и Франции. Соответственно, у сторон оставалось бы и по равному числу самолетов—носителей ядерного оружия среднего радиуса действия.

Тогда кое-кто сел на нового «конька»: стал утверждать, что при равном количестве ракет у сторон Советский Союз будет, мол, иметь преимущество по суммарному числу боеголовок на своих ракетах СС-20. Но и на этом «коньке» долго удержаться не удалось, поскольку Советский Союз выразил согласие договориться о равенстве как по носителям (ракетам и самолетам), так и по боезарядам на них.

В итоге Советский Союз имел бы в европейской зоне и ракет средней дальности, и боеголовок на них значительно меньше, чем до 1976 года, когда у нас вообще не было ракет СС-20, из-за которых, по версии НАТО, загорелся сыр-бор.

Так что же, спрашивается, несправедливого и неприемлемого в нашей позиции? Это—честная, последовательная и одновременно гибкая позиция, основанная на принципе равенства и одинаковой безопасности сторон. И появись у США и их союзников по НАТО малейшее желание действительно договариваться на равных, дела на переговорах в Женеве пошли бы совсем по-другому, и соглашение не заставило бы себя долго ждать.

Вопрос. Помимо упомянутых Вами уверток со стороны США и НАТО, на Западе нередко утверждают, что, соглашаясь сократить число своих ракет средней дальности в европейской части страны, СССР имеет в виду всего лишь перебросить их в восточные районы. Что Вы скажете на этот счет?

Ответ. Подобные утверждения являются заведомой неправдой. Никакой хитрости здесь нет. Мы сами предложили уже некоторое время тому назад, чтобы основным методом сокращения ядерных вооружений средней дальности в Европе был их демонтаж, уничтожение. На переговорах мы прямо сказали американцам: давайте условимся, что и как будет уничтожаться с обеих сторон. Они и от этого уходят.

Сегодня я могу сообщить о нашей готовности сделать еще один крупный шаг.

В случае достижения взаимоприемлемого соглашения, включая отказ США от развертывания в Европе новых ракет, Советский Союз при сокращении своих ракет средней дальности в европейской части страны до уровня, равного числу ракет у Англии и Франции, ликвидировал бы все сокращаемые ракеты. В этом случае ликвидировано было бы и значительное количество самых современных ракет, известных на Западе под названием СС-20.

Вряд ли есть необходимость подчеркивать исключительную важность этого нового проявления доброй воли Советским Союзом.

Во-первых, это выбивает всякую почву из-под распространяемых в странах НАТО утверждений, будто Советский Союз на самом деле намеревается сохранить подлежащие сокращению ракеты СС-20, просто перебазировав их из Европы на Восток.

Во-вторых, лишается каких-либо оснований и высказываемая сейчас Китаем и Японией озабоченность по поводу возможности такого перебазирования.

Из всего сказанного для любого непредубежденного человека должно быть ясно: Советский Союз делал и делает все от него зависящее для нахождения развязок на переговорах, для достижения взаимоприемлемой договоренности, которая предотвратила бы очередной, причем чрезвычайно опасный, виток гонки ядерных вооружений в Европе.

Быть или не быть такой договоренности, зависит от США, от НАТО в целом. Предстоящий раунд переговоров, начинающийся 6 сентября, будет в этом смысле решающим.

Советский Союз на всем протяжении переговоров—хочу это еще раз подчеркнуть—проявляет конструктивный и гибкий подход. Но подчеркну и другое: у нашей гибкости есть свои пределы—они диктуются интересами безопасности Советского государства и его союзников.

И если позиция США на переговорах останется попрежнему неконструктивной и однобокой, и дело дойдет до фактического размещения в Европе американских «Першингов» и крылатых ракет, нам, естественно, придется принять соответствующие контрмеры для сохранения баланса сил и в региональном, европейском, и в глобальном масштабе. Ни у кого не должно быть никакой неясности на этот счет.

Вопрос. В связи с упоминанием Вами Китая в контексте вопроса о ядерных вооружениях в Европе хотелось бы спросить, какова позиция КНР по вопросам ограничения ядерных вооружений и разоружения в целом?

Ответ. У Китайской Народной Республики, как известно, есть свой ядерный потенциал; он постепенно растет. Какого-либо участия в переговорах по ограничению и сокращению ядерных вооружений Китай пока не принимает. Сейчас, насколько мы понимаем, у руководителей КНР как будто появляется интерес к некоторым вопросам, касающимся ядерных и других вооружений, обсуждаемым в ООН и в женевском Комитете по разоружению. Если эта тенденция получит свое развитие, то нет сомнения, что Китай мог бы внести немалый вклад в решение проблем, связанных с предотвращением ядерной войны и прекращением гонки ядерных вооружений.

Вопрос. Вы не хотели бы сказать что-либо о советско-китайских отношениях?

Ответ. Мы считали и считаем аномалией то состояние советско-китайских отношений, в котором они находились на протяжении двух десятилетий.

За последнее время в наших отношениях наметились некоторые положительные тенденции. Между двумя странами ведутся политические консультации на уровне специальных представителей; очередной их раунд начнется 6 октября в Пекине. Растет объем торговли, постепенно развиваются контакты в ряде других областей.

Однако нынешний уровень двусторонних отношений далеко еще не тот, который должен бы быть, по нашему убеждению, между такими крупными и к тому же соседними державами, как Советский Союз и Китайская Народная Республика.

Многое можно сделать в сфере дальнейшего расширения торговли, налаживания экономического и научно-технического сотрудничества, в области культурных, спортивных и иных связей. Улучшению атмосферы в отношениях между двумя странами в значительной степени способствовали бы совместная разработка и осуществление мер доверия в районе советско-китайской границы.

Готовы мы к политическому диалогу с Китаем и по коренным вопросам мирового развития, прежде всего—по вопросам укрепления мира и международной безопасности.

Конечно, у нас с Китаем есть немалые различия в подходах к некоторым важным международным проблемам, к отношениям с отдельными государствами. Но мы твердо исходим из того, что советско-китайские отношения должны строиться таким образом, чтобы они не наносили ущерба третьим странам. Этого мы ожидаем и от китайской стороны.

Оздоровление отношений между СССР и КНР приобретает особую важность и актуальность в условиях нынешнего обострения международной обстановки. Мы уверены, что объективно интересы советского и китайского народов не расходятся в том, что касается устранения военной опасности и упрочения мира. Не говоря уже о том, что мир является идеалом социализма, у обеих наших стран есть большие долгосрочные хозяйственные задачи, для успешного решения которых необходимы благоприятные внешние условия.

Таким образом, от положительного развития советско-китайских отношений в выигрыше будут и наши страны, да и для всей международной обстановки это, несомненно, пойдет на пользу.

На просторах Родины

РЕСПУБЛИКА СЕМИ ГОРОДОВ

Кабардино-Балкария расположена на юге СССР, на Северном Кавказе. По территории — 12,5 тысячи квадратных километров и населению — более 700 тысяч человек она сравнима, может быть, с африканской страной Гамбией.

Кабардино-Балкария — одна из 20 автономных республик, расположенных в СССР. (В настоящее время в составе СССР 35 национальных государств — 15 союзных и 20 автономных республик).

Много трудностей выпало на долю тех, кто начинал строить новую жизнь в Кабардино-Балкарии. Только что отгремела гражданская война (1918—1920 годов). Голод, разруха, эпидемии. Но оба народа — кабардинцы и балкарцы — дружно принялись за работу. На конфискованных у богачей землях создавались коллективные хозяйства (в 1932 году 146 колхозов объединяли уже 92 процента всех крестьянских дворов). С размахом велись мелиоративные работы. В горах началось интенсивное дорожное строительство (через бурные реки были сооружены дороги и мосты). Строились фабрики, заводы.

Ныне Кабардино-Балкарская Автономная Советская Социалистическая Республика — это край с мощной промышленностью, механизированным сельским хозяйством, передовой культурой.

В республике развиты машиностроение, приборостроение и т. д.

Поливные земли Кабардино-Балкарии занимают 110 тысяч гектаров. Здесь собирают рекордные урожаи кукурузы. Например, в прошлом году в колхозах и совхозах было собрано 260 тысяч тонн зерна, в том числе 110 тысяч тонн семенного зерна кукурузы.

До революции в этой горной республике не было ни одного города. Сейчас более половины населения живет в 7 городах. Нальчик из захолустной некогда слободы превратился в цветущую столицу Кабардино-Балкарской АССР, в индустриальный, научный и культурный центр.

В прошлом бездорожная республика покрыта густой сетью дорог — автомобильных и железнодорожных. В селах — электричество, радио, телефон, телевидение. Правда, пока не во всех из них проведен газ (до 10 процентов горных аулов). Большие сдвиги произошли в культурном развитии края. Всего 49 учителей, из которых высшее образование имели лишь 18, одна библиотека, почти поголовная неграмотность населения — вот печальное наследие, которое досталось республике.

Сегодня различными видами обучения охвачено более 160 тысяч человек. За годы одиннадцатой пятилетки (1981—1985 годы) в Кабардино-Балкарии запланировано подготовить 23,2 тысячи специалистов с высшим и средним образованием, 30,8 тысячи квалифицированных рабочих. Один лишь Кабардино-Балкарский государственный университет — центр республиканской научной мысли — ежегодно готовит 1,5 тысячи молодых дипломированных специалистов.

Народы СССР — а их более 100 — читают на своих языках произведения писателей и поэтов Кабардино-Балкарии — Кайсына Кулиева, Алима Кешокова... Балкарцев около 80 тысяч, а тиражи произведений их писателей, изданных на русском и других языках народов СССР, во много раз больше.

В СССР и за рубежом часто гастролирует ансамбль «Кабардинка», созданный полвека назад.

Как у всякого государства, у Кабардино-Балкарии есть свой герб, флаг, Конституция, свои органы власти — однопалатный Верховный Совет, избираемый населением каждые 4 года, его Президиум. Верховный Совет образует Совет Министров. Эта автономная республика представлена в Совете Национальностей Верховного Совета СССР 11 депутатами. Власть на местах осуществляется через Советы народных депутатов.

Советская власть превратила Кабардино-Балкарию в республику, которой доступны все формы современного прогресса.

Владимир КОРНЕВ,
кандидат исторических наук.

МИНСК ГЛАЗАМИ ИНОСТРАНЦЕВ

«НЕ НАДО БОЯТЬСЯ ЛЮДЕЙ, ОНИ ПРЕКРАСНЫ» —

ТАКОЕ ОТКРЫТИЕ СДЕЛАЛИ ДЛЯ СЕБЯ В СССР МОЛОДЫЕ АНГЛИЧАНЕ

За последние двадцать лет высшими и средними специальными учебными заведениями БССР подготовлены тысячи специалистов для различных стран Европы, Азии и Латинской Америки. Несколько тысяч иностранных студентов почти из ста государств мира учатся в нашей республике в настоящее время. Они приезжают к нам не только для того, чтобы овладеть знаниями, получить диплом, но и поближе познакомиться с советской действительностью, встретиться с людьми страны Октября, своими глазами увидеть мир социализма.

В Минском педагогическом институте иностранных языков ежегодно проходят стажировку студенты из Великобритании. Это люди из зажиточных семей, они привыкли жить в роскоши и, обращаясь друг к другу, произносят традиционное «леди» или «джентльмен». Перед тем, как приехать в нашу страну, прошли основательную подготовку. Ждать от них горячих симпатий к советскому образу жизни вряд ли стоит — воспитание накладывает свой отпечаток. И все же факты — упрямая вещь. Три месяца молодые англичане живут в общежитиях вместе с нашими студентами, гуляют по минским улицам, посещают магазины, театры, разговаривают с людьми. Что думают они о советском образе жизни теперь, когда увидели его наяву?

Диана ОЛДРИД: В Минске очень дешевый транспорт, но я все равно предпочитала ходить пешком, чтобы больше увидеть. Билеты в кино и театры удивительно дешевые.

Джейн БЕСТ: Я впервые в Минске. Эта поездка сюда позволила лучше понять советских людей. Мне нравится Минск и белорусский народ — открытый и сердечный.

Нил ДЖЕНКИС: Мне казалось странным, как можно жить в общежитии, где в одной комнате спят три человека. Я к такому не привык. И очень боялся. Оказалось, зря. Пребывание в этом городе — самое яркое впечатление всей моей жизни. Каждый день я старался общаться с советскими людьми, говорил по-русски с утра до вечера. Теперь у меня здесь много друзей, с которыми горько будет прощаться. За три месяца я стал настоящим минчанином.

Эмма БОЙД: От своей подруги, которая была здесь на стажировке раньше, я слышала, что Минск не очень интересный город. Но когда приехала сюда, то не разделила этого мнения. Минск — прекрасный город! Я узнала, сколько страданий перенесли белорусские люди в годы второй мировой войны, что каждый четвертый из них погиб. И поняла, почему отношение к войне здесь другое, чем в Англии.

Я хотела бы всегда жить в этом городе. Люди здесь очень добрые — таких нет в больших городах Запада.

Энн МЮРРЕЙ: Какой щедрый, вежливый, добрый белорусский народ! Очень завидую тем студентам, которые приедут после нас. Жизнь в студенческом общежитии очень понравилась. Мне грустно, потому что пришла пора уезжать.

Филип ХЕСПЕТ: Я второй раз в этом институте и хотел бы побывать еще. Никогда не забуду Хатынь и музей истории Великой Отечественной войны. В Англии мало знают о том, как пострадал Советский Союз от фашистов. Трудно даже представить, что на месте Минска была лишь груда камней.

Советские студенты очень веселые, дружные. Раньше я боялся жить в общей комнате с незнакомыми людьми. Однако легко привык к этому. В вашем общежитии я сделал для себя важное открытие — не надо бояться людей, они прекрасны!

Пол ХЕГГС: В СССР и Англии разные системы образования. Здесь занятия продолжаются долго, по пять-шесть часов в день, шесть дней в неделю и организованы очень интересно. В Англии затрачивается на занятия не более пятнадцати часов в неделю. Студент должен заниматься сам, искать книги, подбирать статьи в библиотеке. Он работает по времени больше советских сверстников, но много — впустую.

Что касается Минска, я едва смог поверить, что этот молодой город насчитывает девять веков, что он смог так быстро отстроиться после войны.

То, что я здесь рассчитывал получить, получил. А самое главное — возможность свободно и обо всем говорить по-русски с советскими людьми...

Постепенно, шаг за шагом избавлялись молодые англичане от пелены, которую набросила им на глаза официальная пропаганда Великобритании. В обыденных для всех нас, советских людей, фактах открывали для себя сенсации. Их удивил уровень высшего образования в БССР, где в 33 вузах обучается около 178 тысяч студентов более чем по 200 специальностям, внимание к нему со стороны государства — на просвещение и науку расходуется ежегодно свыше миллиарда рублей.

Впитывая в себя новую информацию, англичане, конечно, сравнивали ее с положением своей высшей школы. Вузовские лаборатории в Минске оснащены новейшими приборами — самыми лучшими, которые только есть в стране и за рубежом. В том же педагогическом институте иностранных языков при подготовке курсовых, дипломных и научных работ студенты могут пользоваться ЭВМ, не говоря о сложных приборах для анализа и синтеза языков, телевизионных установках и т. п.

Уезжая домой, молодые англичане говорили о том, что увидели совсем иную, удивительную жизнь, достойную глубокого уважения. И каждый подчеркивал, что мечтает вновь побывать в Советской стране.

В. ЛЕВИН.

У дарогу...

Фота Ю. ЗАХАРАВА.

ЦЯПЛО СЯБРОЎСКІХ СУСТРЭЧ

Моцная дружба звязвае працоўных гарадоў-пабрацімаў Магілёўскай вобласці і Габраўскай акругі Народнай Рэспублікі Балгарыі. Яны рэгулярна абменьваюцца дэлегацыямі, пераймаюць вопыт адзін аднаго ў розных галінах жыцця, арганізацыі прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці.

Нядаўна магіляўчане гасцінна прымалі дэлегацыю балгарскіх сяброў у складзе першага сакратара акруговага камітэта БКП Трыфана Пашава, намесніка генеральнага дырэктара вытворчага аб'яднання электрычнай прамысловасці Станіслава Станчава і кіраўніка канструктарскага бюро гэтага ж аб'яднання Героя Сацыялістычнай Працы НРБ Пенча Хрыстава.

НА ЗДЫМКАХ: балгарскія госці на магілёўскім заводзе «Тэхнапрыбор»; шэф-повар рэстарана «Габрава» Р. МІРОНАВА — майстар прыгатавання страў балгарскай кухні; у піянерскім лагеры «Алімпія» штогод адпачывае дзятва з Габрава; сустрэча савецкіх і балгарскіх валейбалістаў.

Фота У. ВІТЧАНКІ і М. ЖАЛУДОВІЧА.

ГАНАРАР У ФОНД МІРУ

«Покліч жыцця і часу» — так называецца зборнік публіцыстычных выступленняў і артыкулаў Ніла Гілевіча, выпушчаны выдавецтвам «Беларусь».

У ім пісьменнік узнімае надзённыя праблемы развіцця беларускай савецкай літаратуры і мастацтва, заклапочана гаворыць аб выхаванні маладых літаратараў, моўным майстэрстве пісьменнікаў. Закранае аўтар таксама пытанні творчых узаемасувязей братніх савецкіх літаратур і сусветных культур, грамадзянскай актыўнасці творцаў.

Ганарар за кнігу публіцыстыкі «Покліч жыцця і часу» Н. Гілевіч перадаў у Савецкі фонд міру.

ЗА ПЕРАКЛАДЧЫЦКУЮ ДЗЕЙНАСЦЬ

Аб'яўлены лаўрэаты літаратурных прэмій Чэхіі за 1982 год. Чэшскі літаратурны фонд, у прыватнасці, прысудзіў прэміі імя Вітэзслава Незвала перакладчыкам — украінцу Раману Лубкіўскаму і беларусу Хведару Жычку.

Х. Жычка пераклады з чэшскай паэзіі публікуе ў друку з 1972 года. У 1977 годзе ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» ў яго перакладзе выйшаў раман Б. Ногейла «Паводка», у 1980 — анталогія сучаснай чэшскай паэзіі «Высокае неба», укладальнікам якой і перакладчыкам значнай часткі кнігі з'яўляецца Х. Жычка.

Х. Жычка быў неаднаразовым удзельнікам міжнародных семінараў перакладчыкаў з чэшскай і славацкай моў, якія праводзяцца раз у два гады ў Празе і Браціславе. Летась за актыўную прапаганду і папулярызацыю славацкай літаратуры ён быў узнагароджаны памятным медалём Славацкага літаратурнага фонду.

Даўно стала традыцыяй адзначаць заканчэнне ўборкі ўраджаю святам апошняга снапа. Адбылося яно і ў працаўнікоў палёў Гродзеншчыны. У калгасе «Прагрэс» перад сельскімі механізатарамі выступіў мясцовы ансамбль песні і танца. Ён выканаў харэаграфічную кампазіцыю з сімвалічнай назвай «Залатыя каласы».

Фота У. КРУКА.

ПАЭТЫЧНЫ СВЕТ ЯГО ПРОЗЫ

ДА 100-ГОДДЗЯ З ДНЯ СМЕРЦІ ВЯЛІКАГА РУСКАГА ПІСЬМЕННІКА ІВАНА ТУРГЕНЕВА

Іван Тургенеў — вялікі пісьменнік XIX стагоддзя — сам незаслужана сціпла ацэньваў сваё месца ў рускай літаратуры: «Я адзін з пісьменнікаў міжцарства — эпохі паміж Гогалем і будучым лідэрам». Калі ж з'явіліся першыя аповесці Льва Талстога «Дзяцінства» і «Малалецтва», менавіта Тургенеў, тады ўжо прызнаны майстар, з нейкім уздыхам аблягчэння сказаў: «Вось, нарэшце, пераемнік Гогаля — зусім на яго не падобны, як яно і трэба было чакаць...»

У сілу абставін Тургенеў большую частку жыцця правёў за мяжой. Магчыма, таму ён быў першым з рускіх пісьменнікаў прызнаны на Захадзе — у Францыі, Германіі, Англіі. Ён быў сябрам Флабэра, Дзікенса, Заля, Дадэ. Аднак заўсёды самым дарагім для Тургенева заставалася Расія, радзіма, і ўсе свае сілы аддаў ён, забываючы пра асабістыя нягоды, прапагандзе рускай культуры за рубяжом. Ён страсна хацеў, каб «Вайна і мір» Льва Талстога, паэмы Пушкіна і Лермантава, проза Гогаля ўвайшлі ў свядомасць зарубежнага чытача як духоўнае багацце Расіі.

Тургенеў любіў мастацтва, саму прастору сусветнай культуры — ад вялікай філасофіі, музыкі Бетховена і Глінкі да твораў Шэкспіра, Кальдэрона і Пушкіна. Усё гэта было для яго на рэдкасць жывым, прадметным, складала заўсёдны свет яго душы. Высокая адукаванасць, зліўшыся з лірычным дараваннем пісьменніка, нарадзілі «катэгорыю тургенеўскага» ў літаратуры. Другі вялікі рускі пісьменнік Міхаіл Салтыкоў-Шчадрын адзначаў высакароднае ўздзеянне творчасці Тургенева: «Ды і што можна сказаць аб усіх наогул творах Тургенева? Ці тое, што пасля прачытання іх лёгка дыхаецца, лёгка верыцца, цёпла адчуваецца? Што адчуваеш, як духоўны ўзровень у табе падымаецца, што ў думках благаслаўляеш і любіш аўтара?»

Воляю лёсу многія гады Тургенеў пражыў у Парыжы. («У дождж Парыж расцвітае, як шэрая ружа»,— скажа ён аднойчы...) Сучаснікі і сябры маладога Тургенева, які толькі яшчэ набіраў сілу пісьменніка, запомнілі яго менавіта ў Парыжы ў 1847 годзе. Вось ён, трыццацігадовы велікан з блакітнымі вачамі і высакароднай асанкай, вечнае дзіця для капрызнай, дэспатычна любячай яго маці, багатай памешчыцы ў Арлоўскай губерні, Паэт, багаты хутчэй задумамі, чым здзяйсненнямі, да таго ж крышачку Дон-Кіхот у сваім пакланенні Прыгожай даме — праслаўленай французскай спявачцы Паліне Віярдо.

У Парыжы, а яшчэ больш актыўна ў Куртаўнелі, у замку мужа і жонкі Віярдо, дзе ён падоўгу жыў, мастак стварыў непаўторны вобраз сваёй «тургенеўскай Русі». Ён піша пра дваранскія маёнткі свайго часу, жыццё якіх добра ведае. Свет тургенеўскіх дваранскіх гнёздаў надзіва цэльны, але і драматычны. Ён у пэўным сэнсе «энцыклапедыя рускага жыцця» ў пераломны яго момант.

Тургенеўскі свет — гэта жывыя куткі Расіі, краіны, надзіва багатай талентамі, багатай цудоўным ідэалізмам юнацтва, мужнасцю і гатоўнасцю да подзвігу. Некранутыя сілы народнай Расіі Тургенеў раскрыў з рэдкай мастацкай пераканаўчасцю ў «Запісках паляўнічага» — кнізе, якая ўпершыню з дабратой і захапленнем расказала аб рускіх сялянах — іх кемлівасці, імкненні да прыгожага, таленавітасці. Песня Якава Турка (апавяданне «Спевакі») быццам рассоўвае сцены і перайначвае слухачоў: «Ён спяваў, і ад кожнага гуку яго голасу павявала чымсьці родным і неабдымна шырокім, быццам знаёмы стэп раскрываўся перад намі, адыходзячы ў бясконцую далечыню...»

Гэтая прастора, якая адыходзіла ў бясконцую далечыню, акіян народнага жыцця прысутнічае як персанаж апавядання ва ўсіх раманах Тургенева. Ён вызначае ўсе канфлікты, усе змены ў «дваранскіх гнёздах», у тых сядзібах, дзе адшукваў Тургенеў і сваіх гераінь («тургенеўскія дзяўчаты»), і сваіх абаяльных, мяцежных шукальнікаў сэнсу жыцця — вандроўніка Рудзіна («Рудзін») або вядомага рэаліста лекара Базарава, заўзятага прапагандыста прыродазнаўчых навук («Бацькі і дзеці»), пакутніка Лаўрэцкага («Дваранскае гняздо»). Усе яны, па сутнасці, вызнаюць адну веру — як знайсці шлях да дзейснага служэння радзіме, быць патрэбным не чыноўніцкай канцылярыі, а Расіі. «Расія без кожнага з нас абысціся можа, але ніхто з нас без яе не можа абысціся. Гора таму, хто гэта думае, удвая гора таму, хто сапраўды без яе абыходзіцца!» — гаворыць адзін з герояў «Рудзіна».

Тургенеў — сучаснік рэформы 1861 года, якая вызваліла рускіх сялян ад прыгонніцтва, сябар пісьменнікаў-рэвалюцыянераў Аляксандра Герцэна, Мікалая Някрасава, а потым і Льва Талстога — быў вельмі чулы да перадавых ідэй часу. Смеласцю, рашучасцю, перадавым светапоглядам пісьменнік надзяляе перш за ўсё сваіх гераінь. Моцная духоўна і высакародная Алена Стахава, якая пайшла за балгарынам Інсаравым у яго краіну, каб удзельнічаць у вызваленчай барацьбе («Напярэдадні»). Марыяна разам з Няжданавым уступае на цяжкую дарогу, якая вядзе да будучай рэвалюцыйнай барацьбы («Навіна»). Гераіні твораў Тургенева — гэта канцэнтрацыя ўсіх лепшых спадзяванняў пісьменніка.

Знамянальна, што руская рэвалюцыйная моладзь 70—80 гадоў XIX стагоддзя ўгадвала ў тургенеўскім вершы ў прозе «Парог» паэтычны гімн сабе — духоўнай прыгажосці, напахіснасці і паслядоўнасці маладых змагароў.

Тургенеў верыў у вялікую прыцягальную сілу высакародных чалавечых якасцей, якія ўславіў і якія сапраўды зрабілі тургенеўскую прозу такой патрэбнай чытачу і сёння.

Віктар ЧАЛМАЕЎ,
літаратурны крытык.

СВЯТЫ І БУДНІ САМАДЗЕЙНАГА КАЛЕКТЫВУ

БЕЗ ЦЫМБАЛАЎ, БЕЗ ДУДЫ НОГІ ХОДЗЯЦЬ НЕ ТУДЫ

У гэтую сонечную раніцу каля рэспубліканскага Палаца культуры прафесійна-тэхнічнай адукацыі стаялі некалькі вялікіх аўтобусаў. Маладыя хлопцы і дзяўчаты складвалі ў багажнік рукзакі, спартыўныя сумкі, мячы, бадмінтон. Адразу было відаць: моладзь выязджае на адпачынак. Але вось па лесвіцы спусціліся некалькі хлопцаў, якія неслі цымбалы ў чахлах. Так-так, у аўтобусы грузіўся цэлы цымбальны аркестр. Прынеслі гітару і скрыпку, а за імі некалькі футляраў зусім маленькіх — драўляныя дудачкі. Паступова інструменты былі клапатліва размешчаны, сталі ўладкоўвацца і ўдзельнікі аркестра. Усё ў парадку, можна ад'язджаць. Уперадзе немалая дарога. Аўтобусы накіроўваюцца на славутыя Браслаўскія азёры, на спартыўна-аздараўленчую базу. Тут на працягу 20 дзён самадзейныя артысты народнага цымбальнага аркестра будуць адпачываць, папраўляць здароўе, займацца спортам і, вядома, рэпеціраваць.

Пуцёўкі на базу адпачынку яны атрымалі бясплатна. Арганізацыя такога адпачынку ўжо стала традыцыяй.

— Мы вельмі задаволены тым, што ў нас ёсць магчымасць адпачываць разам і адначасова займацца музыкай, — расказваюць удзельнікі аркестра. — Бо мы ж не прафесійныя музыканты, а навучэнцы розных прафтэхвучылішчаў. Будучыя харчавікі, будаўнікі, радыётэхнікі, друкары, нават садаводы. А музыкай мы займаемся ў вольны час. Цымбалы, дудачкі, скрыпка, бубен сталі нашымі пастаяннымі спадарожнікамі. Так што вядомая беларуская прымаўка «Без цымбалаў, без дуды ногі ходзяць не туды» — гэта быццам бы пра нас.

Музыканты-аматары вельмі многа выступаюць у розных гаспадарках рэспублікі, перад воінамі Савецкай Арміі, на будоўлях, на прамысловых прадпрыемствах Мінска, былі нават у касманаўтаў у Зорным Гарадку. Пастаянна ўдзельнічае цымбальны аркестр у літаратурных святах у Вязынцы і Мікалаеўшчыне. Яркай старонкай у творчым жыцці калектыву быў удзел у культурнай праграме Алімпіяды-80 у Маскве. У адным з тагачасных рэпартажаў ёсць такія словы: «Народны цымбальны аркестр з Мінска з'явіўся, безумоўна, упрыгожаннем культурнай праграмы... Трэба было чуць, з якой чысцінёй выконваліся народныя напевы, як сумна і пяшчотна прагучала мелодыя вальса Свірыдава з кінафільма «Завіруха», як цікава і арыгінальна выконвалася знаёмая музыка на цымбалах».

У рэпертуары аркестра многа твораў. Вялікую праграму паказаў аркестр нядаўна: тут былі «Танец з «Палескай сюіты» Яўгена Глебава, «Спеў дуброў» Валерыя Іванова, «Груздаўская вясельная полька», беларускія народныя песні «Пасылала баба дзеда» і «Быў у мяне муж» у выкананні салісткі аркестра Галіны Уласенка. Класіка была прадстаўлена «Пасакальяй» Гендэля і «Венгерскім танцам № 1» Брамса. На гэтым аглядзе народны цымбальны аркестр атрымаў галоўны прыз і заняў першае месца.

Нядаўна, у час творчай паездкі ў Маскву на свята прафтэхадукацыі «Мы малады рабочы клас», аркестр быў запісаны на Цэнтральным тэлебачанні.

— Мы вельмі хваляваліся, калі нас запрасілі на студыю, — расказвае кіраўнік аркестра Генадзь Ермачэнкаў, — бо гэта ж такая адказнасць — выступаць перад усёй краінай! Але запіс прайшоў удала, удзельнікаў пахвалілі і за шчырае выкананне, і за сцэнічную культуру, спадабаліся і нашы нацыянальныя ўборы.

Аркестр цяпер з'яўляецца адным з лепшых самадзейных калектываў рэспублікі, але ён і адзін з самых маладых. Створаны ў 1970 годзе цымбалістам Міхаілам Філістовічам з невялікага ансамбля, калектыў зараз налічвае 40 чалавек. Для іх удзел у аркестры — гэта пастаянныя сустрэчы з мастацтвам, творчыя кантакты з прафесійнымі кампазітарамі, спевакамі, музыкантамі. Гэта і сяброўства, і цікавыя вечары моладзі, і канцэртныя паездкі. Калектыў вельмі дружны, бо моладзь звязваюць агульныя інтарэсы. Нават скончыўшы вучобу, удзельнікі аркестра не парываюць з ім сувязі: прыходзяць на рэпетыцыі, канцэрты. А некаторым аркестр даў пуцёўку у мастацтва. Напрыклад, былы сталяр Генадзь Клімовіч цяпер працуе канцэртмайстрам у Дзяржаўным аркестры народных інструментаў імя Жыновіча. Выпускнік Аршанскага вучылішча Валерый Філіпаў вучыцца на завочным аддзяленні Белдзяржкансерваторыі і працуе выкладчыкам Маладзечанскага музычнага вучылішча. У аркестр ходзяць цэлымі сем'ямі, як, напрыклад, браты Анатоль, Леанід і Андрэй Мірошкіны. Трэба дадаць, што аркестр з'яўляецца пастаяннай творчай базай пераддыпломнай практыкі студэнтаў кафедры аркестравага дырыжыравання Мінскага інстытута культуры.

На канцэртах аркестра заўсёды пануе святочны настрой. Самадзейных артыстаў добра прымаюць усюды. З павагай да яго адносяцца і прафесійныя музыканты.

— З вялікай творчай цікавасцю сачу за народным цымбальным аркестрам рэспубліканскага Палаца культуры прафтэхадукацыі, — гаворыць заслужаны дзеяч мастацтваў БССР, мастацкі кіраўнік Дзяржаўнага аркестра імя І. Жыновіча М. Казінец. — Гэта калектыў вялікіх выканаўчых магчымасцей, калектыў аднадумцаў, якіх аб'ядноўвае шчырая любоў да беларускіх цымбалаў, да беларускай песні і інструментальнай музыкі. Выступленні аркестра на аглядах-конкурсах, у канцэртах перад працаўнікамі даказваюць вялікую жыццёвую сілу народнага беларускага інструмента.

Валянціна ТРАМБІЦКАЯ.

НА РАДЗІМЕ М. ГАРЭЦКАГА

Пачаліся работы па стварэнню музея вядомага беларускага савецкага пісьменніка Максіма Гарэцкага на яго бацькаўшчыне — у вёсцы Малая Багацькаўка Мсціслаўскага раёна.

Вырашана адпавіць хату, у якой нарадзіўся і рос будучы пісьменнік. Усё тут застаецца такім, як было яшчэ ў канцы мінулага стагоддзя. Цесляры-умельцы Ходасаўскага лясніцтва ўзвядуць будынак па эскізу, што распрацаваў брат Максіма Іванавіча акадэмік АН БССР Гаўрыла Гарэцкі. Паляводы мясцовага калгаса пядаўна атрымалі пачэснае заданне — сярпамі зжаць участак высокага жыта і падрыхтаваць салому для даху хаты-музея. Збіраюцца і экспанаты будучых экспазіцый.

ДРУГОЕ ВЫДАННЕ СЛОЎНІКА

Факсімільным спосабам выдавецтва «Беларуская Савецкая Энцыклапедыя» імя Петруся Броўкі ўзнавіла славуты «Словарь белорусского наречия» І. Насовіча, выпушчаны ў 1870 годзе. Яшчэ да выдання гэтая праца была высока ацэнена вучонай грамадскасцю Расіі і ўдастоена Дзямідаўскай прэміі. Пра высокія вартасці «Слоўніка» сведчыць і тое, што вялікі пралетарскі пісьменнік Максім Горкі, знаходзячыся ў Італіі, вельмі прасіў рэдакцыю «Нашай нівы» выслаць яму гэту кнігу. З цягам часу «Слоўнік» І. Насовіча стаў унікальнай з'явай, бібліяграфічнай рэдкасцю.

І вось факсіміле з экземпляра, які знаходзіцца ў пісьменніка Барыса Сачанкі. Прадмову для перавыдання напісаў член-карэспандэнт АН БССР М. Суднік.

ЯК ВЫДАВАЎСЯ ЗБОРНІК МІХАСЯ МАШАРЫ «МАЛЮНКІ»

АТРЫМЛІВАЛА ЛІСТЫ, А Ў ІХ — ВЕРШЫ...

З УСПАМІНАЎ ЗОСЬКІ ВЕРАС

...Такім чынам, Міхась Машара, чарговы адказны рэдактар, які падпісвае газету «Наша воля», на Лукішках... Значыцца, у мяне новы падапечны.

Прадуктовыя пачкі, якія рыхтаваліся ў рэдакцыі два разы на тыдзень — у чацвер і ў нядзелю, — адносілі палітычным вязням вучні Віленскай беларускай гімназіі, якія прыходзілі да нас фальцаваць газету. Але газеты, часопісы, часам кніжкі трэба было мне самой адносіць у пракуратуру, адкуль яны са штампам пракуратуры адсылаліся ў турму. Лісты вязням і ад іх таксама праходзілі праз пракуратуру.

Паперу, канверты і г. д. вязні куплялі ў сябе ў канцылярыі і недастатку ў гэтым не мелі.

У хуткім часе я пачала атрымліваць ад Машары лісты. Пісаў, што чуецца добра і заняўся самаадукацыяй, а таксама пачаў пісаць вершы па-беларуску. (Відаць, раней пісаў па-руску).

Лісты прыходзілі штораз часцей, а ў іх — вершы... З самага пачатку яны крыху кульгалі, а чым далей, тым былі лепшыя і лепшыя. Мае заўвагі аўтар прымаў з удзячнасцю.

Пяць з гэтых вершаў былі надрукаваныя ў дзіцячым часопісе «Заранка»: «Я восень люблю...», «Восень, рада вёска...», «Зімовыя малюнкі», «З вясковых малюнкаў», «Вітаю Новы год».

Апрача гэтых вершаў, прыслаў Машара ў «Заранку» прозу: пераклад з польскай «Крот» і ўласнае апавяданне «Ноч перад Новым годам».

А вершаў набіралася ўсё больш і больш... Складала я ўсе лісты з вершамі ў асобную папку і не пераставала думаць: што з імі рабіць? Як іх выкарыстаць?

Раскідаць па газетах не хацелася... Вось каб выдаць асобнай кніжкай? Хоць бы маленькай? Усё ж быў бы нейкі пачатак...

Выдаць не цяжка, але ніякіх фондаў на гэта не было. У выдавецтва з драбязой няма чаго ісці. А каб так, уласнымі сіламі?..

У гэтай справе то ўжо трэба парадзіцца з нашымі наборшчыкамі, што працавалі пры газеце. Было іх трое: Уладзімір Рэшатаў, Дудка і стары латыш Магнус. Выбрала я пятнаццаць вершаў і пайшла з імі ў друкарню. Друкарня Левіна на вуліцы Нямецкай, № 22 невялічкая, але чыстая, уласнік ветлівы. У першым пакоі працуюць наборшчыкі ды стаіць столік для карэктара, у другім машына — гаспадарка машыніста, старога Пярловіча.

Прывітаўшыся з усімі, пытаюся ў наборшчыкаў:

— Маеце хвіліну часу, можна з вамі пагаварыць?

— Зараз, зараз, вось толькі скончым гэты рукапіс, каб пасля не збіцца... А пачка (так яны мяне называлі) мае, мусіць, нешта новае на думцы? Так чуе мой нос, — смяецца Рэшатаў.

— Праўда, маю. Ну, але канчайце. Я пачакаю.

Нядоўга прыйшлося чакаць. Скончыўшы сваю работу, сабраліся наборшчыкі, прыйшоў Пярловіч, нават Левін. Цэлая канферэнцыя.

Я расказала аб вершах Машары і аб маёй думцы.

— Што вы на гэта скажаце? — пытаюся.

— Ды што тут доўга гаварыць, — кажа Рэшатаў, — набраць, адбіць і ўсё...

— Так, але грошай на гэта няма...

— А на што грошы? На паперу і друк. А набраць? Мы ўтрох за гадзіны дзве набяром, ці ж за гэта плату браць будзем?

— Ну і мне таксама плаціць не трэба, — кажа Пярловіч, — толькі гаспадар друкарні хіба палічыць за фарбу, шрыфт і святло — і то не шмат...

Левін усміхнуўся і кіўнуў галавой.

— Калі так, то ўсё добра. Давайце аблічым, колькі трэба паперы, і пайду яе купляць.

— А грошы? — пытаюцца.

— Гэта ўжо мая справа...

Купіла я паперы, на вокладку таксама. Прынесла і адразу аддала разам з вершамі.

Перапісваць нічога не трэба было. Нашы наборшчыкі набіралі проста з рукапісаў. Я выкрасліла чырвоным алоўкам, што не патрэбна, адзначыла крыжыкамі выбраныя вершы і адразу распланавала.

Праз два дні прынеслі мне карэктуру. Яшчэ пару дзён, і кніжачка «Малюнкі» была гатовая.

Я пакінула для Міхася Машары аўтарскія экземпляры, а рэшту (здаецца тыраж быў 200 ці 250 экземпляраў — не помню) — на камісійны продаж. Выйдзе аўтар на волю — кнігарня з ім разлічыцца...

Вось як выдаваўся зборнік Міхася Машары «Малюнкі».

Зоська ВЕРАС
(Л. ВОЙЦІК).

У ФРАНЦУЗСКІМ ЧАСОПІСЕ

Часопіс «Сюд», які з'яўляецца вядучым літаратурным выданнем поўдня Францыі і выходзіць у горадзе Марселі, выпусціў пад назвай «Савецкая паэзія» спецыяльны нумар. У ім шырока прадстаўлена творчасць многіх савецкіх паэтаў.

У нумары змешчаны вершы народных паэтаў Беларусі Петруся Броўкі і Максіма Танка, а таксама Рыгора Барадуліна.

прэм'еры, выстаўкі, сустрэчы

НАШЫ ГОСЦІ

У кожны свой прыезд на месячныя курсы ў Мінск выкладчыкі беларускай мовы і літаратуры з Беласточчыны (ПНР) сустракаюцца з пісьменнікамі. На гэты раз на сустрэчу з імі прыйшлі Максім Танк, Ніл Гілевіч, Барыс Сачанка, Іван Чыгрынаў, Віктар Карамазаў, Алена Васілевіч, Васіль Вітка. У час гутаркі закраналіся пытанні выхавання падрастаючага пакалення, ролі мастацкай літаратуры ў жыцці дзіцяці. Госці пазнаёміліся з работай пісьменніцкай арганізацыі рэспублікі, з сучасным станам развіцця беларускай літаратуры.

З МІНСКА Ў АФІНЫ

Слаўная гісторыя беларускага краю, героіка Вялікай Айчыннай вайны і сённяшнія працоўныя здзяйсненні — тэмы гравюр, адпраўленых з Мінска ў Афіны. У экспазіцыю ўключаны творы мастакоў А. Кашкурэвіча, Г. Паплаўскага, В. Шаранговіча, Л. Асецкага, А. Пасляровіч і іншых аўтараў.

У дарогу адправілася таксама выстаўка лепшых работ народных майстроў: пано і вырабы з саломкі, гліны, лёну.

Абедзве выстаўкі арганізаваны па праграме Дзён Савецкага Саюза ў Грэцыі.

НА ТАШКЕНТСКАЙ СЦЭНЕ

Вялікі гонар выпаў народнаму ансамблю танца «Вязанка» клуба Мінскага маторнага завода. Ён прадстаўляў беларускае самадзейнае мастацтва на святкаванні 2000-годдзя Ташкента, якое адзначалася ў жніўні.

Ансамбль «Вязанка» створаны больш за дзесяць гадоў назад. За гэты перыяд з яго майстэрствам пазнаёміліся гледачы Польскай Народнай Рэспублікі, Італіі. Самадзейныя артысты неаднаразова выязджалі з канцэртамі ў Малдавію, а таксама прымалі актыўны ўдзел у культурнай праграме, прысвечанай адкрыццю XXII Алімпійскіх гульняў у Маскве.

На сцэнах Ташкента ансамбль выканаў харэаграфічную сюіту «Героям грамадзянскай вайны прысвячаецца», беларускія народныя танцы «Лявоніха», «Юрачка», «Закрутанка», «Цімошка» і іншыя, а таксама танцы народаў СССР.

ТУРНЭ ПА УКРАІНЕ

Больш чым месяц працягваліся сёлетнія гастролі Дзяржаўнага народнага аркестра БССР імя І. Жыновіча па гарадах Роўна, Цярнопаль, Івана-Франкоўск, Кіеў, Жытомір, Вінніца, Адэса, Нікалаеў, Ялта, Севастопаль. Аркестр быў удзельнікам некалькіх фестываляў мастацтваў. Паспяхова праходзілі выступленні з аркестрам саліста Беларускай дзяржаўнай філармоніі, народнага артыста БССР З. Бабія. За выдатныя творчыя дасягненні і вялікую работу па прапагандзе народнай музыкі аркестр, якім кіруе заслужаны дзеяч мастацтваў БССР М. Казінец, узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Украінскай ССР.

ШЭФСТВА НАД МЕТРАБУДАЎЦАМІ

Нядаўна па ініцыятыве праўлення Мінскай гарадской арганізацыі таварыства кнігалюбаў Саюз пісьменнікаў БССР узяў шэфства над метрабудаўцамі.

Адбылася першая сустрэча. Тэма гаворкі — «Літаратура ў барацьбе за мір».

З цікавасцю слухалі будаўнікі вядомага беларускага крытыка і літаратуразнаўцу М. Мушынскага, які спыніўся на найбольш значных творах беларускай прозы апошніх гадоў, адзначыўшы іх антываенную, гуманістычную скіраванасць.

Паэт Б. Спрынчан прачытаў некалькі сваіх твораў, а таксама вершы Г. Бураўкіна і П. Броўкі, якія пераклаў на рускую мову.

У Дзяржаўным акадэмічным тэатры оперы і балета Беларускай ССР адбылася прэм'ера оперы П. Чайкоўскага «Пікавая дама». Рэжысёр-пастаноўшчык С. Штэйн.
НА ЗДЫМКУ: Ліза — народная артыстка БССР І. ШЫКУНОВА, Герман — лаўрэат усесаюзнага конкурсу В. ЭКНАДЗІЕСАЎ.
Фота У. МЯЖЭВІЧА.

ДЗЕЯЧЫ КУЛЬТУРЫ Ў ПЕРШЫХ РАДАХ БАРАЦЬБІТОЎ ЗА МІР

БЫЦЬ АБО НЕ БЫЦЬ

Барыс Яфімаў — адзін з самых папулярных савецкіх мастакоў. Яго палітычная карыкатура трапна б'е па падпальшчыках вайны.

Карэспандэнт АДН сустрэўся з правадзейным членам Акадэміі мастацтваў СССР Б. ЯФІМАВЫМ і папрасіў яго падзяліцца думкамі аб значэнні антываеннага руху, аб ролі творчай інтэлігенцыі ў барацьбе за мір.

— Няма нічога больш важнага, чым мір. І я вельмі рады, — гаворыць Барыс Яфімавіч, — што абсалютная большасць людзей прытрымліваецца такога пункту гледжання. Узнікненне пагрозы гібелі цывілізацыі, разбурэння ўсіх яе дасягненняў нараджае ў кожнага разумнага, а дакладней — у кожнага думаючага чалавека імкненне такую пагрозу ліквідаваць. Небывалы размах антываеннага руху пацвярджае гэта. Сёння гамлетаўскае пытанне: «Быць або не быць?» задаецца ўжо ўсім чалавецтвам. Разрадка або далейшае нагнятанне напружанасці, мір і творчасць пад чыстым небам або апакаліпсічная ядзерная катастрофа — вось галоўнае пытанне сучаснасці.

— Што, па-вашаму, асабліва характэрна для сённяшняга этапа барацьбы за мір?

— Тое, што людзі самых розных сацыяльных, палітычных, эстэтычных поглядаў аказаліся адзінымі ў сваёй нянавісці да вайны, да ракет, да тэрмаядзернай зброі, бомбаў і супербомбаў. Ніколі яшчэ, бадай, не было так ясна, што ў чалавецтва ёсць агульная і неадкладная справа — захаваць мір. Усе ўдзельнікі апошніх міжнародных канферэнцый, сімпозіумаў, сустрэч, нягледзячы на рознасць поглядаў і перакананняў, прыходзяць да адзінага выводу: абвастрэнне міжнароднага становішча, знішчэнне многіх станоўчых вынікаў разрадкі выгадна толькі для ворагаў міру.

— Якая роля мастака ў барацьбе за мір? Што ён можа і павінен рабіць?

— Ад мастака ці пісьменніка ў многім залежыць, як будуць паводзіць сябе і дзейнічаць яго гледачы і чытачы. У звароце VI з'езда мастакоў СССР да мастакоў планеты прагучаў заклік — аб'яднаць намаганні ў барацьбе за перамогу розуму і гуманізму. Леанарда да Вінчы, гаварылася ў гэтым звароце, сцвярджаў, што першым мастацкім творам быў контур чалавечага ценю на сцяне, асветленай сонцам. Ці можна дапусціць, каб апошнім адлюстраваннем стаў цень чалавека, спаленага ядзерным выбухам? Сіла мастацтва вялікая. І яна павінна заўсёды і ўсюды мацаваць дружбу і супрацоўніцтва паміж народамі. Я і мае калегі з задавальненнем адзначаем, што на многіх форумах, у прыватнасці на нядаўняй Сусветнай асаблеі ў Празе «За мір і жыццё, супраць ядзернай вайны», гучна і аўтарытэтна прагучаў голас дзеячаў культуры. У многіх краінах яны выступаюць у першых радах руху за мір. Пісьменнікі, мастакі, рэжысёры, артысты здольны сваёй творчасцю ўзняць многамільённыя масы людзей на барацьбу супраць вайны і ваеннай пагрозы. І тое, што яны ўсё больш актыўна ўключаюцца ў гэтую барацьбу, — адна з гарантый непераможнасці справы міру.

— Якой павінна быць, па-вашаму, палітычная сатыра сёння?

— Сатыра павінна быць злой, каб адстойваць дабро. Яна павінна быць суровай і непрымірымай, каб змагацца за мір. Яна павінна быць баявой і наступальнай, каб эфектыўна выступаць супраць вайны і агрэсіі. Яна павінна быць бязлітаснай, каб абараніць чалавека і чалавецтва ад прыгнёту і цемрашальства. І нарэшце, — гэта вельмі важна — сатыра павінна быць смешнай, каб зброяй смеху абараняць самую сур'ёзную справу — мір на Зямлі.

— Вы — старшыня аргкамітэта IV Міжнароднай выстаўкі «Сатыра ў барацьбе за мір», якая адкрыецца ў кастрычніку гэтага года ў Маскве. Не маглі б вы спыніцца на характэрных асаблівасцях гэтага агляду?

— Аб гэтым гаворыць дэвіз выстаўкі — «Спыніць гонку ўзбраенняў, узмацніць барацьбу за разрадку міжнароднай напружанасці». Мэта агляду — папулярызаваць сродкамі выяўленчага мастацтва поспехі, дасягнутыя прыхільнікамі міру, выкрываць дзеянні падпальшчыкаў вайны, яўных і скрытых агрэсараў. Удзельнічаць у выстаўцы запрошаны ўсе мастакі, згодныя з яе дэвізам. Вынікі конкурсу падвядзе аўтарытэтнае міжнароднае журы.

Выстаўка кветак у Мінску — традыцыйная. Кожны год у канцы жніўня ці пачатку верасня аматары кветаводства, навуковыя ўстановы збіраюць у выставачнай зале сталічнага Палаца мастацтва свае цудоўныя экспазіцыі. Сёлета на іх былі прадстаўлены кветкі Цэнтральнага батанічнага сада, саўгаса «Дэкаратыўныя культуры», Мінскага гарадскога аддзялення Таварыства аховы прыроды, рэспубліканскай станцыі юных натуралістаў усяго 248 відаў, сартоў, форм і гібрыдаў раслін. Многія з экспанатаў — удзельнікі ВДНГ СССР і атрымалі там залатыя і сярэбраныя медалі. Але ўражваюць наведвальнікаў не толькі гэтыя «дыпламаваныя» красуні... Кранаюць сваім хараством, выдумкай кветкавыя кампазіцыі, выкананыя дзіцячымі рукамі: «Выглянула сонейка», «Школьны вальс», «Першакласнікі», «Касцёр» і іншыя. Дарэчы, тут жа, у выставачнай зале, можна атрымаць кваліфікаваную кансультацыю спецыяліста-кветавода. А гэта — падстава меркаваць, што ў наступным годзе ўдзельнікаў у традыцыйнай выстаўцы кветак будзе яшчэ больш.

Фота Ю. АЛЯКСАНДРАВА.

УНУЧКА ПУШКІНА НА БАБРУЙШЧЫНЕ

Нядаўна, будучы ў камандзіроўцы ў вёсцы Цялуша Бабруйскага раёна, звярнула ўвагу на адзінокую магілу, што знаходзіцца ў цэнтры вёскі. На магіле стаіць абеліск з наступным мемарыяльным надпісам: «Наталля Аляксандраўна Пушкіна, па мужу Варанцова-Вельямінава. 3 снежня, 1912 г., 53 гады».

Я зацікавілася лёсам Наталлі Аляксандраўны. Гутарыла з жыхарамі вёскі Цялуша, якія ў адзін голас гаварылі, што тут, у гэтай магіле, сапраўды пахавана ўнучка вялікага рускага паэта А. Пушкіна. І хоць Наталлі Аляксандраўны ўжо даўно няма ў жывых, памяць аб ёй сярод мясцовых жыхароў жыве і зараз.

Цікавасць да ўнучкі вялікага паэта прывяла мяне ў музей Пушкіна ў Ленінградзе, матэрыялы якога пацвердзілі, што ўнучка А. Пушкіна Наталля Аляксандраўна пахавана ў Цялушы. Шэраг каштоўных звестак пра Наталлю Аляксандраўну паведаміла навуковы супрацоўнік гэтага музея Л. Фяўчук. У выніку мне ўдалося даведацца наступнае.

Наталля Аляксандраўна нарадзілася ў 1859 годзе ў Пецярбурзе. Яе бацька Аляксандр Пушкін быў старэйшым сынам паэта. Аляксандр Аляксандравіч быў генералам царскай арміі, чалавекам незвычайных здольнасцей. Ён удзельнічаў у рускатурэцкай вайне 1877—1878 гадоў і за адвагу і мужнасць, праяўленыя ў баях за вызваленне Балгарыі ад турэцкага прыгнёту, атрымаў шэраг ордэнаў.

У 1881 годзе Наталля выйшла замуж за П. Варанцова-Вельямінава, афіцэра гусарскага Нарвскага палка, якім камандаваў яе бацька А. Пушкін. Яна прыняла прозвішча мужа. Праз некалькі гадоў пасля жаніцьбы П. Варанцоў-Вельямінаў пайшоў у адстаўку і разам з сям'ёй пераехаў жыць у свой маёнтак Вавулічы на Бабруйшчыне, недалёка ад Цялушы.

Н. Варанцова-Вельямінава атрымала добрую дамашнюю адукацыю, скончыла гімназію. Сучаснікі адзначалі, што яна была валявой, рознабакова развітай, начытанай, вельмі здольнай жанчынай.

Наталля Аляксандраўна пісала вершы, малявала пейзажы і партрэты. Але ні паэзіі, ні жывапісу сур'ёзнага значэння не надавала. Альбомы з яе вершамі і малюнкамі недзе згубіліся, і таму меркаваць аб іх каштоўнасці нельга.

Для Наталлі Аляксандраўны былі характэрныя выключнае абаянне, высокія маральныя якасці. Яна чула адносілася да сялян навакольных вёсак, да беднякоў. Аказвала ім усялякую дапамогу — хлебам, лякарствамі. Хворых сялян уладкоўвала на лячэнне да ўрачоў. Шмат увагі Наталля Аляксандраўна ўдзяляла пісьменнасці сялян, арганізацыі народных школ для іх дзяцей. Яна давала мясцовым жыхарам чытаць кнігі, расказвала аб жыцці і творчасці свайго геніяльнага дзеда.

Г. ДУЛЕБА,
кандыдат гістарычных навук.

У ХАЦЕ ПАЛЯЎНІЧАГА

Ні ў адным з даведнікаў гэты музей не значыцца. Тым не менш ён існуе. У Рэчыцы, на вуліцы Савецкай, 132, гасцінна расчынены яго дзверы. Гаспадар хаты-музея Барыс Кандраценка (ён жа экскурсавод) шчыра запрашае да сябе кожнага, каго цікавіць жывёльны свет палескіх лясоў. У калекцыі васьмідзесяцітрохгадовага паляўнічага амаль дзве сотні чучалаў звяроў і птушак, пачынаючы ад звычайнай вавёркі і канчаючы арлом-змеяедам — вельмі рэдкай для Беларусі птушкай, якую ён знайшоў цяжка параненай у балоце, але выхадзіць так і не здолеў.

Барыс Міхайлавіч ужо і не прыпомніць, калі дакладна ён зрабіў першы экспанат сваёй калекцыі.

— Даўно гэта было. Мо гадоў трыццаць назад, а мо і болей. Памятаю толькі, што першым зрабіў чучала чорнага каршуна. Валтузіўся з ім доўга. Разоў некалькі закідваў яго на шафу, заракаючыся больш брацца за гэтую справу. Але ж на наступны дзень даставаў яго адтуль і зноў корпаўся да прыцемак... Гэта надзвычай тонкая і карпатлівая праца, якая патрабуе не толькі ўмення, але і вялікай усядлівасці...

Быццам жывыя, сядзяць у хаце на галінах дразды, івалгі, арэхаўкі, сойкі, каралькі... Дзяўбе ствол дзяцел... Натапырыўшы вушы, да нечага прыслухоўваецца заяц... На задніх лапах прыўзняўся буры мядзведзь. Побач, выскаліўшы зубы, стаіць воўк. Са сцяны грозна пазірае дзік...

Барыс Міхайлавіч заўсёды чакае адкрыцця чарговага паляўнічага сезона, каб абнавіць і папоўніць экспазіцыю свайго музея.

І. СТРАКАЎСКІ.

Гумар

Шатландзец пытае прыяцеля:

— Скажы, як табе ўдалося пазбавіцца ад заікання?

— Гэта здарылася, калі мне давялося званіць з Глазга ў Лондан па тэрміновамy тарыфу.

●

Навабранец скардзіцца земляку:

— Капрал урэзаў мне чацвёра сутак гаўптвахты.

— За што?

— Не ведаю, але з іх двое — як раз за гэта самае пытанне.

●

Урач не можа паставіць дыягназ і асцярожна распытвае хворага:

— Скажыце, а раней гэта з вамі бывала?

— Так.

— Усё ясна. Значыць, зноў схапіла.

●

— Доктар, мы з жонкай надзвычай гарачлівыя людзі, дня не праходзіць, каб мы не пасварыліся. Што мне рабіць?

— Думаю, уся справа ў лішку энергіі. Параю вам, сіньёр Чаліні, хадзіць мінімум па дзесяць кіламетраў у дзень. Пазваніце мне тыдні праз два і скажаце, як ідуць справы.

Праз паўмесяца сіньёр Чаліні пазваніў доктару і радасна пракрычаў у трубку:

— Дзякуй, доктар, усё проста выдатна!

— А як з жонкай, не сварыцеся?

— Вядома не, я ўжо за сто пяцьдзесят кіламетраў ад дому!

Спорт

ПЯЦЬ залатых медалёў заваявалі савецкія тэнісісты на першынстве Еўропы, якое прайшло ў Юрмале.

Сярод пераможцаў — Сяргей Леанюк з Беларусі. У фінале ў пары з масквічом Аляксандрам Зверавым ён перамог чэхаславацкі дуэт у складзе Й. Чыхака і П. Войцішака.

У ЛАТВІІ прайшоў чэмпіянат СССР па спартыўнаму арыенціраванню. Ігар Якаўкін (БССР) стаў сярэбраным прызёрам у асабістым заліку.

ГАНДБАЛІСТЫ Мінскага СКА занялі чацвёртае месца на міжнародных спаборніцтвах у югаслаўскім горадзе Дабой. Перамогу ў турніры атрымала каманда «Металапластык» — чэмпіён Югаславіі.

МІНЧАНІН Вячаслаў Дыдышка стаў пераможцам міжнароднага турніра шахматыстаў у польскім горадзе Паляніца. Ён паказаў добры вынік — 10 ачкоў з чатырнаццаці магчымых і на паўачка абышоў другога прызёра, чэхаславацкага шахматыста Іржы Ляхцінскага.

У спаборніцтвах удзельнічалі спартсмены Венгрыі, Балгарыі, Польшчы, Кубы, Югаславіі, Румыніі і Індыі.

НА ЧЭМПІЯНАЦЕ Еўропы па водных відах спорту, які прайшоў у Італіі, праведзены спаборніцтвы па скачках з вышкі і трампліна сярод жанчын.

У скачках з вышкі званне чэмпіёнкі заваявала савецкая спартсменка Ала Лабанкіна. На гэтым снарадзе за зборную нашай краіны выступала і мінская школьніца Анжэла Стасюлевіч. Яна стала сярэбраным прызёрам чэмпіяната.

На Дняпры.

Фота Э. ЭЛЬКСІНА.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

НАШ АДРАС:

МІНСК-ГСП, ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 44.
ТЭЛЕФОНЫ: 33-01-97, 33-02-80, 33-03-15, 33-16-56, 33-07-82.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Зак. 1461